УДК [94(476)+327(438+47+57)(091)]"1921/1924"

# Дзейнасць Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг.

***Бароўская В.М.***
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск*

*Рыжскі дагавор заклаў асновы суіснавання савецкіх рэспублік і Польшчы. Дзейнасць Змешаных камісій, прадугледжаных для выканання дагавора, яўна дэманстравалі не імкненне бакоў да кампрамісу, адсутнасць схемы вырашэння спрэчных пытанняў.*

*Мэта даследавання – ахарактырызаваць дзейнасць Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг., вылучыць беларускі накірунак у яе функцыянаванні.*

***Матэрыял і метады.*** *Вывучэнне дзейнасці Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг. адбывалася пры выкарыстанні спецыяльных гістарычных метадаў, прынцыпаў гістарызму і аб'ектыўнасці.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Рыжскім дагаворам (арт. XVI) прадугледжвалася стварэнне Змешанай разліковай камісіі, якая павінна была вырашыць пытанне эвакуіраваных у Расію фінансавых інстытутаў, кампенсацыі ўкладаў насельніцтва Польшчы, суб'ектаў гаспадарання ў банках Расіі, вызначыць памеры, спосабы і тэрміны выплаты; займацца вырашэннем спраў, якія датычацца прыватна-юрыдычных адносін абедзвюх дзяржаў.*

***Заключэнне.*** *Безвыніковасць працы Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг. цалкам была заканамернай, улічваючы праблемныя двухбаковыя адносіны паміж РСФСР (СССР) і Польшчай. Ігнараванне савецкім бокам XV–XVIII артыкулаў дагавора выклікала складанасці пры ўсталяванні эканамічных сувязей і заключэнні гандлёвага дагавора.*

***Ключавыя словы:*** *Рыжскі дагавор, узаемаразлікі, кампенсацыя, рээвакуацыя, ліквідацыя маёмасці.*

*(Ученые записки. – 2023. – Том 37. – С. 20–24)*

# Activities of the Mixed Settlement Commission in 1921–1924

***Borovskaya O.N.***
*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk*

*The Treaty of Riga laid the foundations for the coexistence of the Soviet Republics and Poland. The activities of the Mixed Commissions, provided for the implementation of the agreement, clearly demonstrated the parties' lack of desire for compromise, the absence of a scheme for resolving disputes.*

*The purpose of the article is to characterize the activities of the Mixed Settlement Commission in 1921–1924, highlight the Belarusian direction in its functioning.*

***Material and methods.*** *The study of the activities of the Mixed Settlement Commission in 1921–1924 occurred with the use of special-historical methods, the principles of historicism and objectivity.*

***Findings and their discussion.*** *The Treaty of Riga (Art. XVI) provided for the creation of the Mixed Settlement Commission, which was supposed to resolve the issue of financial institutions evacuated to Russia, compensation of deposits of the population of Poland, business entities in Russian banks, determine the amounts, methods and terms of payments; deal with cases related to the private-legal relations of both states.*

***Conclusion.*** *The ineffectiveness of the work of the Mixed Settlement Commission in 1921–1924 was completely behind the scenes, due to the problematic bilateral relations between the RSFSR (USSR) and Poland. Ignoring the XV–XVIII articles of the Treaty by the Soviet side caused difficulties in establishing economic ties and concluding a trade agreement.*

***Key words:*** *Riga Treaty, mutual settlements, compensation, re-evacuation, liquidation of property.*

*(Scientific notes. – 2023. – Vol. 37. – P. 20–24)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: borovskaya-olga@mail.ru*** *– В.М. Бароўская*

Рыжскі мірны дагавор заклаў асновы мірнага суіснавання савецкіх рэспублік і Польшчы. Зразумела, што адным юрыдычна-прававым актам нельга пабудаваць сістэму сяброўскіх і стабільных двухбаковых сувязей. Для гэтага патрабаваліся гады існавання на мяжы вайны і міру, пры наяўнасці вялікага пачуцця варожасці ў грамадстве і кіраўніцтве дзвюх краін. Знешнепалітычныя ведамствы Польшчы і РСФСР (СССР), улічваючы агульны курс краіны і сітуацыю ў Цэнтральна-ўсходнееўрапейскім рэгіёне, імкнуліся наладзіць узаемаадносіны, зняць напружанасць і пабудаваць эфектыўную мадэль вырашэння праблем. Дзейнасць Змешаных камісій (рээвакуацыйнай і спецыяльнай, камісіі па рэпатрыяцыі, пагранічнай, ваенна-ўзгадняльнай і інш.), прадугледжаных для практычнага выканання Рыжскага дагавора і Дамовы па рэпатрыяцыі, яўна дэманстравалі не імкненне бакоў да кампрамісу, адсутнасць схемы вырашэння спрэчных пытанняў. Гэта выклікала не толькі затрымку ў іх працы, але і пагражала разрывам дыпламатычных адносін.

Глыбокія супярэчнасці паміж польскім, беларускім, украінскім, расійскім бакамі ў адзнаках тых падзей не зніклі да гэтага часу, працягваючы абцяжарваць адносіны паміж суверэннымі краінамі на сучасным этапе. Адзнакі савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду да гэтага часу носяць супярэчлівы характар. Праблематыка Змешанай разліковай камісіі слаба вывучана ў замежнай і айчыннай гістарыяграфіі. Варта ўзгадаць даследаванні Ю. Куманецкага [1], П.Н. Альшанскага [2] і В.М. Цынкевіча [3]. Мэта даследавання – ахарактыразаваць дзейнасць Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг., вылучыць беларускі накірунак у яе функцыянаванні. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы: вывучыць нарматыўна-прававую базу стварэння і існавання Змешанай разліковай камісіі, раскрыць прычыны неэфектыўнасці яе дзейнасці, выявіць сувязь працы камісіі з Ліквідацыйным камітэтам па справах былых расійскіх юрыдычных асоб і Спецыяльнай камісіі па ацэнцы страт, нанесеных дзеяннямі польскай арміі і акупацыйнымі польскімі ўладамі дзяржаве, прыватным асобам і ўстановам на тэрыторыі БССР.

**Матэрыял і метады.** Вывучэнне пытання дзейнасці Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг. адбывалася пры выкарыстанні спецыяльных гістарычных метадаў, прынцыпаў гістарызму і аб’ектыўнасці. Пры дапамозе гісторыка-сістэмнага метаду даследавання ўдалося ахарактарызаваць структурна-функцыянальныя параметры дзейнасці Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг. Сістэма ўзаемаразлікаў знаходзілася ў прамой залежнасці ад існуючага становішча савецка-польскіх адносін.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Рыжскім мірным дагаворам (арт. XVI) прадугледжвалася стварэнне Змешанай разліковай камісіі (ЗРК), якая павінна была вырашыць пытанне эвакуіраваных у Расію фінансавых інстытутаў, кампенсацыі ўкладаў насельніцтва Польшчы, суб’ектаў гаспадарання ў банках Расіі. Камісія павінна была займацца пытаннямі ўзаемаразлікаў паміж польскім і расійска-ўкраінскім бакамі, вызначыць памеры, спосабы і тэрміны выплаты. Таксама камісія займалася вырашэннем спраў, якія датычаліся прыватна-юрыдычных адносін абедзвюх дзяржаў і выплатай прэтэнзій юрыдычным і фізічным асобам, што паступалі на адрас Міністэрства фінансаў Польшчы і Народнага камісарыята фінансаў РСФСР, УССР і іншых дзяржаўных інстытуцый як польскіх, так і расійска-ўкраінскіх. У сферу дзейнасці ЗРК траплялі і тыя разлікі, якія вынікалі з працэсу рээвакуацыі польскай прыватнай і дзяржаўнай маёмасці [4, с. 703].

Згодна з артыкулам XVI Рыжскага мірнага дагавора, расійска-ўкраінскі бок абавязваўся правесці з Польшчай разлік па фондах і капіталах, завешчаных ці ахвяраваных для польскіх юрыдычных і фізічных асоб і якія знаходзяцца згодна з абавязковымі пастановамі на захаванні ці на рахунках у дзяржаўных касах ці крэдытных установах былой Расійскай імперыі. Для правядзення разлікаў, прадугледжаных у артыкулах XIV, XV, XVI, XVII Рыжскага дагавора, і для ўсталявання прынцыпаў гэтых разлікаў у выпадках, не прадугледжаных дагаворам, а таксама для вызначэння памеру, спосабаў і тэрмінаў выплаты па вышэйзгаданых разліках стваралася напрацягу 6-ці тыдняў са дня ратыфікацыі дагавора Змешаная разліковая камісія, якая складалася з 5-ці прадстаўнікоў з кожнага боку і неабходнай колькасці экспертаў, з месцазнаходжаннем у Варшаве. Тэрмінам, да якога павінны быць прымеркаваны ўсе разлікі, прымаецца 1 кастрычніка 1915 г. Разлікі адбываюцца ў рускіх залатых рублях. У 1921 расійска-украінская дэлегацыя Змешанай разліковай камісіі прыбыла ў Варшаву, ужо ў 1924 г. яна вярнулася ў Маскву. Польская дэлегацыя была створана 1 чэрвеня 1921 г., расійска-ўкраінская дэлегацыя своечасова не з’явілася ў польскай сталіцы. Затрымка ў працы камісіі звязана з хваробай старшыні расійска-ўкраінскай дэлегацыі Л.Л. Абаленскага [5, s. 122–123].

Пасля ноты Міністэрства замежных спраў (МЗС) Польшчы 10 кастрычніка 1921 г. паўнамоцнае прадстаўніцтва РСФСР і УССР у Польшчы паведаміла, што расійска-ўкраінская дэлегацыя знаходзіцца са жніўня ў Варшаве і чакае пачатку працы разліковай камісіі. На гэты факт МЗС звярнула ўвагу савецкае прадстаўніцтва 20 кастрычніка 1921 г. У выніку I пасяджэнне адбылося 3 лістапада 1921 г. З польскага боку ў ім узялі ўдзел старшыня польскай дэлегацыі Ю.К. Карсніцкі, члены: С. Каузік, С. Крулікоўскі, С. Макавецкі, Т. Навойскі, расійска-украінская дэлегацыя: старшыня – Л.Л. Абаленскі, члены: М.І. Багалепаў, І.Я. Хургін, Б.Р. Зуль.

Падчас I пленарнага пасяджэння ЗРК былі разгледжаны тэхнічныя пытанні, абмеркаваны спосабы ажыццяўлення разлікаў. Быў зацверджаны рэгламент

камісіі. Пацверджана неабходнасць дастаўкі расійска-ўкраінскім бокам вывезных актаў і дакументаў, неабходных для ажыццяўлення ўзаемаразлікаў. Для правядзення разліковых аперацый прызнавалася неабходным наяўнасць архіўных дакументаў, вывезеных з Польшчы падчас Першай сусветнай вайны: архіў ізб і скарбовых кас, дзяржаўных дабрачынных кас, аддзелаў гарадскіх банкаў, сялянскіх і шляхецкіх банкаў, эвакуіраваных прыватных крэдытных устаноў.

У рэгламенце было зацверджана, што ў пленарных пасяджэннях мелі права прымаць удзел паўнамоцныя члены абедзвюх дэлегацый, тэхнічныя працаўнікі, выкліканыя старшынёй дэлегацыі. Час і месца пасяджэнняў, дзённы парадак павінны быць устаноўлены шляхам паразумення старшынь абедзвюх дэлегацый. Рабочыя мовы: польская, руская і ўкраінская. Пратаколы вядуцца кожным бокам на польскай і рускай мовах. Існавала магчымасць стварэння падкамісій для разгляду канкрэтнага пытання.

II пасяджэнне ЗРК, якое адбылося 5 снежня 1921 г., было прысвечана разгляду пытання вызначэння тэрміна звароту дакументальных асноў узаемаразлікаў. Праз два месяцы расійска-ўкраінскі бок, на тэрыторыі якога знаходзіліся ўсе неабходныя крыніцы, павінен быў ажыццявіць рээвакуацыю матэрыялаў цэнтральных устаноў, разлікі якіх праводзіліся праз Галоўную дзяржаўную касу (Цэнтральны ці Пецярбургскі аддзел Расійскага дзяржаўнага банка), пачынаючы з 1 студзеня 1916 г., прадставіць інфармацыю аб узаемных даўгах, даверчых лістоў. Акрамя таго расійска-ўкраінскі бок абавязваўся прыслаць друкаваныя экзэмпляры ўсіх бюджэтаў дзяржаўных інстытуцый 1915–1917 гг.

5 снежня 1921 г. польская частка ЗРК выдае пастанову, згодна з якой усім асобам, якія прэтэндуюць на ўзаемаразлікі, патрэбна звяртацца ў канцылярыю польскай дэлегацыі, асобную камісію у Варшаве, або праз консульствы і прадстаўніцтвы за мяжой. Заявы павінны мець пры сабе дадаткі ў выглядзе дакументальных доказаў з дакладна вызначанай лічбай маёмасці ці маёмасных правоў, якія яны жадаюць вярнуць. Пасля папярэдняга разгляду заяў з дадаткамі, яны дасылаюцца на адрас расійска-ўкраінскай дэлегацыі, якая ў месячны тэрмін ад даты атрымання дае афіцыйны адказ аб мэтазгоднасці разлікаў. У выпадку, калі ў месячны тэрмін не будзе атрыманы адказ ад расійска-ўкраінскага боку, то заява павінна быць задаволена цалкам. Адказы рыхтуюцца ў спецыяльных падкамісіях, якія складаюцца з 4 членаў экспертаў (па 2 з кожнага боку). Рашэнне прымаецца большасцю галасоў. Пры роўнасці галасоў справа перадаецца на разгляд у галоўную камісію ЗРК яшчэ на два месяцы.

Падчас трох першых пленарных пасяджэнняў не было прынята ніякага рашэння адносна прынцыпу і механізму разлікаў. 12 снежня 1921 г. была разгледжана прапанова польскай дэлегацыі ў Змешанай разліковай камісіі па пытанні ўстанаўлення асноў па ўрэгуляванні разлікаў з польскімі грамадзянамі, былых служачых урадавых устаноў (арт. XVII, ч. 2, арт. XVIII). Служачыя ваенных і грамадзянскіх, чыгуначных, грамадскіх устаноў былога Каралеўства Польскага і Расійскай імперыі, таксама іх нашчадкі (удовы і сіроты) мелі права прэтэндаваць на выплаты ўсіх запазычанасцей па заработнай плаце і пенсіях і іншых невыплачаных сум [6, s. 8]. Праз два тыдні (26 снежня 1921 г.) было ўзнята пытанне аб пратэрмінаванай запазычанасці гарадскіх і сельскіх гмін на рахунках былой Расійскай імперыі [6, s. 76]. У выкананне п. 2. арт. XVII Рыжскага дагавора Расія і Украіна абавязуюцца ажыццявіць разлік па сумах дэбіторскіх запазычанасцяў гарадскіх і сельскіх гмін Савецкаму ўраду на момант падпісання Рыжскага дагавора. РСФСР (БССР) і УССР прызнаюць запазычанасці, якія былі прызнаны расійскімі ўладамі да выплаты са скарбу дзяржавы, але не былі да гэтага часу выплачаны; запазычанасці той жа катэгорыі пералічаных у сувязі з эвакуацыяй кіраўніцтва магістратаў і гмін на тэрыторыю былой Расійскай імперыі; надзвычайныя выдаткі. Для ажыццяўлення гэтых разлікаў польскі ўрад абавязуецца прадставіць савецкаму боку спіс прэтэнзій, якія падлягаюць звароту. Спісы павінны змяшчаць: прэтэнзіі асобных гмін, падзеленых на пазіцыі, доказ кожнай пазіцыі, прызнавалася неабходным прыкласці дакументы, якія паказваюць асаблівасці звароту.

У сакавіку 1922 г. па ініцыятыве польскай дэлегацыі было ўзнята пытанне ажыццяўлення разлікаў па прэтэнзіях польскіх фізічных і юрыдычных асоб да расійскіх паштовых і паштова-тэлеграфных устаноў як эвакуіраваных, так і тых, якія дзейнічаюць на тэрыторыі РСФСР (БССР) і УССР [6, s. 76]. Выплаты прадугледжваліся за невыплачаныя паштовыя і тэлеграфічныя пераводы, паштовыя выплаты за выданыя пасылкі; нерэалізаваныя векселі; недастаўленыя каштоўныя пасылкі і заказныя лісты. У гэты ж час была агучана прапанова польскай дэлегацыі ў ЗРК па пытанні ўрэгулявання запазычанасці былым вайскоўцам Расійскай імперыі, польскім грамадзянам (афіцэрам, лекарам, фельдчарам, вайсковым служачым, жаўнерам, санітарам, майстрам артылерыі) на агульную суму 119.458 036 руб. (пенсіі, выплаты на харчаванне, сталыя і спецыяльныя выплаты) на 24 000 чалавек [6, s. 166].

3 жніўня 1922 г. у падкамісіях былі распрацаваны два праекты: 1) у справе ажыццяўлення разліку польскіх укладаў у расійскіх дзяржаўных банках і дзяржаўных ашчадных касах; 2) у справе звароту фондаў устаноў узаемнага страхавання [5, s. 122–123]. У 1922 г. Змешаная разліковая камісія зацвердзіла зварот фінансаў на суму 24,04 млн руб., але без вызначэння яго механізму. Палякі патрабавалі звароту дадаткова 242,9 млн руб. (з іх 140 млн залатых руб. – маёмасць ашчадных касаў, дзе 600 тыс. грамадзян Польшчы трымалі зберажэнні).

27 снежня 1924 г. было зацверджана распараджэнне Прэзідэнта Польшчы “Аб ахове правоў на прад’яўніка

(маёмасці), вывезенай на тэрыторыю СССР, якая захоўваецца ва ўстановах на гэтай тэрыторыі" і распараджэння Міністра фінансаў Польшчы ад 16 лютага 1925 г. уладальнікі маёмасці ці капіталаў павінны былі не пазней 1 лістапада 1925 г. падаць заяву аб сваіх прэтэнзіях у Галоўнае ліквідацыйнае ўпраўленне. У выніку савецкаму боку была выстаўлена значная сума ў 1.368.211.82 залатыя рублі. Аднак як указвала польская дэлегацыя ў сваёй справаздачы, атрыманне гэтых сродкаў было практычна немагчымай справай з-за адсутнасці паразумення паміж бакамі па дадзеным пытанні. Па прычыне немагчымасці рэстытуцыі фондаў польскае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб іх ліквідацыі.

Распараджэннем Прэзідэнта Польшчы І. Масціцкага 22 сакавіка 1928 г. "Аб ліквідацыі маёмасці былых расійскіх юрыдычных асоб" быў створаны Ліквідацыйны камітэт па справах былых расійскіх юрыдычных асоб. Старшыня камітэту – У. Якубоўскі [7, арк. 7]. У дадатку да I інагурацыйнага пасяджэння Ліквідацыйнага камітэта ўказвалася, што асноўнай прычынай стварэння камітэта і выдання распараджэння ад 22 сакавіка 1928 г. стала нежаданне кіраўніцтва СССР выконваць свае фінансава-эканамічныя абавязкі па Рыжскім дагаворы, у прыватнасці аб выплаце кампенсацыі за нацыяналізаваную маёмасць прыватных асоб, таварыстваў. Згодна з Грамадзянскім кодэксам СССР 1922 г., нацыяналізацыі падлягала маёмасць прыватных банкаў, гарадскіх пабудоў, царкоўная маёмасць, прыватныя бальніцы, гандлёвыя прадпрыемствы. Нацыяналізаваліся не толькі прадпрыемствы, якія належалі расійскім грамадзянам, але і размешчаныя на тэрыторыі СССР прамысловыя і транспартныя прадпрыемствы, што належалі змешаным акцыянерным таварыствам і кампаніям, а таксама асобным іншаземцам [7, арк. 76]. У выніку ў галоўным упраўленні Ліквідацыйнага камітэта і Міністэрстве фінансаў былі зарэгістраваны 200 аб'яднанняў з агульным капіталам у 50 млн злотых [8, арк. 16].

4 ліпеня 1928 г. на V пасяджэнні Ліквідацыйнага камітэта была разгледжана справы аб ліквідацыі маёмасці Мінскага аграрнага таварыства, у прыватнасці сельскагаспадарчай фермы і млына ў маёнтку Тухановічы (Навагрудскае ваяводства), дакледчых палёў ў фальварку Новы Свет, маёмасць спіртзавода ў маёнтку Тухановіч. Член камітэту Е. Гжымала-Пакрыўніцкі адзначаў цяжкасці з вызначэннем уладальніка маёмасці. Справа ўскладнялася тым фактам, што 11 красавіка 1914 г. Ю. Тухаоўская прадала маёмасць Мінскаму аграрнаму таварыству, але з захаваннем права пажыццёвага ўладання [9, арк. 83–84]. Згодна з успамінамі Э. Вайніловіча, старшыні адзначанага таварыства з 1907 па 1921 г., продаж адбыўся ў 1901 г. за мінімальна нізкую цану [10, с. 178]. У выніку камітэт прыняў пастанову аб ліквідацыі маёмасці адзначанага таварыства на карысць польскай казны.

Для таго каб супрацьпаставіць фінансавым патрабаванням Польшчы свае, савецкі бок актыўна збіраў звесткі аб стратах, нанесеных суб'ектам гаспадарання і прыватным асобам польскімі войскамі. Гэта асабліва датычылася тэрыторыі БССР і беларускіх земляў у складзе РСФСР. Ужо 27 студзеня 1919 г. пры НКЗС БССР быў створаны эканамічна-прававы аддзел, які збіраў матэрыялы аб зверствах польскіх акупантаў, такое ж даручэнне было дадзена наркаматам і мясцовым органам улады. 21 студзеня 1922 г. Пастановай СНК БССР была створана Спецыяльная камісія па ацэнцы страт, нанесеных дзеяннямі польскай арміі і акупацыйнымі польскімі ўладамі дзяржаве, прыватным асобам і ўстановам на тэрыторыі БССР (Камісія па ацэнцы страт). У склад Камісіі па ацэнцы страт уваходзілі прадстаўнікі (старшыні) ад цэнтральных ведамстваў БССР – Народнага камісарыята юстыцыі БССР, Народнага камісарыята ўнутраных спраў БССР, Народнага камісарыята земляробства БССР, Рабоча-сялянскай інспекцыі, Цэнтральнага статыстычнага таварыства. На чале камісіі стаяў глава статыстычнага ведамства БССР – М.І. Шкубер (1922–1927 гг.).

Камісія па ацэнцы страт складалася з Цэнтральнай камісіі, шасці павятовых камісій, якія ў сваю чаргу дзяліліся на сто шаснаццаць валасных камісій. Згодна з заданнямі Камісіі па ацэнцы страт, усе страты былі падзелены на некалькі ключавых груп. Першая вялікая група датычылася гарадоў: сюды ўключаліся ўсе страты, нанесеныя гаспадарцы ад разбурэнняў будынкаў, з-за адсутнасці рамонту (муніцыпальныя пабудовы, асабістыя дамы), ад ваеннага пастою. Другая група была разлічана на прамысловыя прадпрыемствы: тут знаходзіліся страты, нанесеныя з-за адсутнасці рамонту, ад невытворчага выкарыстання (перарасход вады), ад неатрымання даходаў ад вытворчасці прадпрыемстваў. Трэцяя група ўключала дарожныя страты (грунтавыя, маставыя, шасейныя, масты). У чацвёртую групу былі ўключаны агульнабюджэтныя страты гарадской і земскай гаспадаркі за 1914–1917 гг. (падзенне даходаў, расходы на ваенныя патрэбы, асігнаванні Усерасійскаму Саюзу гарадоў і Земскаму саюзу) [11, арк. 88–88ад.]. Акрамя гэтага, усе страты былі падзелены на дзве групы – тыя, якія былі нанесены польскімі войскамі і акупацыйны ўладамі, і тыя, якія сталі вынікам бандыцкіх налётаў. У другую групу прапаноўвалася ўключыць страты, нанесеныя войскамі С.Н. Булак-Балаховіча, С.В. Пятлюры. У ходзе працы камісій па ацэнцы страт складаліся акты аб нанесеных стратах або згубах, абавязкова ў прысутнасці пацярпелага, сведак і экспертаў. У акце павінны былі пазначацца месцы, дзе адбылося рабаванне, з дакладным вызначэннем вёскі, воласці, павета; прозвішча, імя пацярпелага, прычына нанесенай страты, дакладная назва прадметаў, іх колькасць у пудах ці іншых адзінках вымярэння, прыкладная сума страты ў рублях даваеннага часу [11, арк. 396].

Народны камісарыят замежных спраў РСФСР у шматлікіх інструкцыях і тэлеграмах, накіраваных на адрас Цэнтральнай камісіі па ацэнцы страт, раіў звярнуць большую ўвагу на страты, нанесеныя

ў пагранічнай паласе. Справа ў тым, што гэтая тэрыторыя фактычна не падпарадкоўвалася савецкай уладзе. Да канца працы Змешанай пагранічнай камісіі (ліпень 1922 г.) на ёй знаходзіліся не толькі савецкія вайсковыя часткі, але і польскія фарміраванні. Камісія па ацэнцы страт павінна была правесці абследаванне пагранічнай тэрыторыі на прадмет незаконнай высечкі лясоў, ажыццяўлення рабаванняў [11, арк. 285]. Супрацоўнікам павятовых і валасных камісій прадпісвалася скласці акт па ацэнцы страт, куды ўносіліся прозвішча і імя пацярпелага, назва населенага пункта, прычына страты, дакладны пералік усіх рэквізаваных прадметаў (у адзінках вагі), прыкладная сума страты ў даваенных рублях [11, арк. 396]. Складзеныя акты па ацэнцы неабходна было накіроўваць ва Узгадняльную камісію па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў.

21 красавіка 1922 г. член калегіі НКЗС РСФСР Я.С. Ганецкі прапанаваў паверанаму ў справах Польшчы ў Маскве З. Стэфаньскаму стварыць спецыяльную змешаную камісію для разгляду патрабаванняў савецкіх рэспублік аб кампенсацыі страт, нанесеных у выніку нападаў на савецкую тэрыторыю банд з Польшчы. Польскі бок адмовіўся.

Падвесці вынікі працы Камісіі па ацэнцы страт удалося толькі ў жніўні 1922 г. Менавіта ў гэты час на адрас Народнага камісарыята замежных спраў паступіла справаздача камісіі, у якой былі ўказаны ўсе лічбы, з пералікам на царскія, даваенныя рублі, керанкі. Так, па рэспубліцы страты складалі 9 млрд 34 млн 208 тыс. 319 савецкіх рублёў або 52 млн 29 тыс. 281 залатых даваенных рублёў і 34 капейкі [11, арк. 365].

**Заключэнне.** Безвыніковасць працы Змешанай разліковай камісіі ў 1921–1924 гг. цалкам была заканамернай, улічваючы праблемныя двухбаковыя адносіны паміж РСФСР (СССР) і Польшчай. Складанае эканамічнае становішча Савецкай дзяржавы не дазваляла ёй у поўным аб'ёме выканаць свае фінансава-эканамічныя абавязацельствы, прадугледжаныя Рыжскім дагаворам. Ігнараванне савецкім бокам XV–XVIII артыкулаў дагавора выклікала складанасці пры ўсталяванні эканамічных сувязей і заключэнні гандлёвага дагавора. У сваю чаргу кіраўніцтва Савецкіх рэспублік імкнулася супрацьпаставіць польскім прэтэнзіям патрабаванні ў кампенсацыі страт савецкіх грамадзян, панесеных падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. і нападаў на прыгранічныя тэрыторыі БССР з кастрычніка 1920 г. і па кастрычнік 1921 г. Нягледзячы на тое, што згодна з VIII артыкулам Рыжскага мірнага дагавора, абодва бакі адмаўляліся ад выплаты ваенных страт, якія былі нанесены мірным жыхарам у перыяд ваенных дзеянняў і аперацый.

## Літаратура


1. Kumaniecki, J. Po traktacie ryskim / J. Kumaniecki. – Warszawa: Książka i wiedza, 1971. – 282 s.
2. Ольшанский, П.Н. Рижский договор и развитий советско-польских отношений. 1921–1924 гг. / П.Н. Ольшанский. – М., 1974. – 285 с.
3. Цынкевіч, В.М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1921–1929 гг. / В.М. Цынкевіч. – Мінск: БДУ, 2004. – 127 л.
4. Документы внешней политики СССР: в 24 т. / редкол.: Г.А. Белов [и др.]. – М., 1959. – Т. 3: 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 723 с.
5. Archiwun Akt nowych (AAN). Zespół MZS. Sygn. 9391.
6. AAN. Zespół Ministerstwa zagragnicznych spraw. Sygn. 6739a.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1461. Воп. 1. Спр. 1.
8. НАРБ. – Ф. 1461. Воп. 1. Спр. 3.
9. НАРБ. – Ф. 1461. Воп. 1. Спр. 15.
10. Войнилович, Э. Воспоминания / Э. Войнилович; пер. с пол. – Минск, 2007. – 380 с.
11. НАРБ. – Ф. 9. Воп. 1. Спр. 1.


*Паступіў у рэдакцыю 03.03.2023*